Рыхтуем да выдання

Мікола Маляўка. Выбраныя творы. Серыя «Лаўрэаты Нацыянальнай літаратурнай прэміі»

Укладанне Віктара Шніпа

Яго паэзія ў нас яшчэ як след не ацэнена, яна яшчэ патрабуе свайго ўдумлівага прачытання. Спяваў паэт не з «чужога голасу», ад чаго перасцерагаў і сваіх калег, а меў свой мілагучны і непаўторны, які пазнаеш з аднаго радка.

Казімір Камейша

Мікола Маляўка

РАДНЯ

Мы не цураемся радні —
Людзей жывых, людзей аджылых.
У нас ад продкаў — карані,
У нас ад продкаў — кроў у жылах.

Разбудзіць раніцай жаўрук,
І дбаем мы пра хлеб у полі.
У нас ад продкаў — сіла рук,
У нас ад продкаў — сіла волі.

Мы памагаем боль уняць,
Мы падтрымаем у няшчасці.
У нас ад продкаў — дабрыня,
У нас ад продкаў — сэрца насцеж.

Не засумуе з намі госць,
А ў скокі пойдзе, будзьце пэўны.
У нас ад продкаў — весялосць,
У нас ад продкаў — голас спеўны.

Шырэе пакаленняў круг,
Не зарастае ў Храм дарога.
У нас ад продкаў — мірны дух,
У нас ад продкаў — вера ў Бога.

А хто цураецца радні,
Святыні нашы зневажае, —

Чужыя мае карані,
І кроў таксама ў іх чужая.

* * *

Касіў за бацьку сена дзед-сусед.
Вайна ішла, а ў нас сквірчэла сала:
Яечняй мама дзеда частавала.
Як для мяне, дык царскі быў абед!
Касец, прагаладаўшыся як след,
Над скавародкай завіхаўся дбала,
Відаць было: яечні той замала,—
Падчысціць хлебам скавародку дзед.

З дакорам мама зіркала, ды ўсё-ткі
Не адыходзіў я ад скавародкі.
І дзед не даядаў усіх яец,
Садзіў мяне, малога, на калені,
З усмешкай падахвочваў: «Еш, касец!..»
А мама плакала, сышоўшы ў сені.

* * *

Марозіла ваенная зіма.
З перадавой тады, у час суровы,
І прыляцеў, як галубок паштовы,
Трохкутнічак салдацкага пісьма.
«Як наш сынок? Здаровы?.. Дроў няма —
Сячыце сад, парэжце плот на дровы...»
О, як у тыле грэлі тыя словы! —
Збярогся ліст акопны нездарма.

Даўно ўжо, адрасант і адрасатка,
Для сына вы — журботная прыгадка.
Акацыя над вамі расцвіла,—
А галубок паштовы, склаўшы крылы,
Усё яшчэ жыве ў гняздзе стала —
І сілы мне дае, ахоўнік мілы.

* * *

Вышэе неба. Прыбывае дзень.
Адтаяў ад марозу дол чыгунны.
Зямля — як скрыпка, ручаінкі — струны,
І не хаваецца ў захмарны цень
Смычок вясёлы — сонечны прамень.
Вясна прыйшла, і цешыць скрыпкай чуйнай
Штодзень яна, маэстра вечна юны,—
Пад музыку працуй і летуцень.

Слабеюць ручаінак гукі-зыкі,
Але смычок не хібіць у музыкі,
Не анямела скрыпка, як у сне:
Вясна натхнёна-лёгка, без заганы,
Іграе на адной жывой струне,—
І свет увесь замёр, зачараваны.

ЗА ЖЫТНІМ ПОЛЕМ — ЛЕС СІНЕЕ

За жытнім полем — лес сінее.
Здаецца, гледзячы здаля,
Што недзе там злілася з небам —
І стала космасам зямля.

Як арка перад раем вечным,
Вясёлка ззяе ў сіняве.
Туды сыходзім Шляхам Млечным.
Там продкі ўсе. Там Бог жыве.

Там падарожнікаў не слепяць
Імжа і спёка, пот і пыл,
І толькі воблачка, як лебедзь,
Плыве за мройны небасхіл.

Чаму ж адтуль, нібы з няволі,
Душа вяртаецца назад —
Сюды, дзе жыта спее ў полі
І зелянее родны сад?..